(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 327(474/476:470:485)(091)"16"(043.3)+
327(438:470:485)(091)"16"(043.3)

ДЗЕМІДОВІЧ
Алена Васільеўна

# ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ Ў ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНЫХ АДНОСІНАХ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ З РАСІЯЙ І ШВЕЦЫЯЙ У ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVII СТ.

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.15 – гісторыя міжнародных адносін
і знешняй палітыкі

Мінск, 2012

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Навуковыя кіраўнікі: **Лойка Павел Алегавіч**,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

**Варонін Васіль Аляксеевіч**,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Часноўскі Мечыслаў Эдвардавіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар, рэктар УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна";

**Мікалаева Людміла Віктараўна**,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі"

Апаніруючая арганізацыя: УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"

Абарона адбудзецца 19 верасня 2012 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.20 у Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўд. 407.

Тэлефон вучонага сакратара: 259-70-05

E-mail: dostanko@bsu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Аўтарэферат разасланы "6" ліпеня 2012 г.

В.а. вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый
доктар палітычных навук, прафесар — Ю.І. Малевіч

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## УВОДЗІНЫ

Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ), апынуўшыся ў складзе Рэчы Паспалітай (РП), згодна з Люблінскай уніяй 1569 г. павінна было сумесна з Каралеўствам Польскім (КП) праводзіць агульную знешнюю палітыку. Аднак рэаліі ўзаемастасункаў ВКЛ і КП паказалі, наколькі гістарычная рэчаіснасць адрознівалася ад унійных імператываў. Геапалітычнае становішча, уласныя інтарэсы ВКЛ і КП абумоўлівалі рознае стаўленне гэтых дзяржаўных адзінак да актуальных праблем знешняй палітыкі. Акрамя таго, шмат у чым аўтаномны статус ВКЛ у складзе федэратыўнай дзяржавы забяспечваў яму магчымасці кіравацца ўласным бачаннем знешнепалітычных спраў, што не заўсёды адпавядала інтарэсам манарха і КП.

Палітыка РП на міжнароднай арэне ў першай трэці XVII ст. характарызавалася шматвектарнасцю. Асаблівая актыўнасць праявілася ў некалькіх напрамках. Адбывалася змаганне са Швецыяй, дзе ў якасці прычыны выступілі прэтэнзіі Жыгімонта III Вазы на дынастычныя правы, але, па сутнасці, гэта была барацьба за Прыбалтыку. Да таго ж, акрэслены прамежак часу азнаменаваўся для РП неадназначнымі ўзаемаадносінамі з Расійскай дзяржавай.

Улічваючы выключнасць знешнепалітычнай сітуацыі (зацяжныя канфлікты з суседнімі краінамі, што ў далейшым абумовіла новы расклад міжнародных адносін), у якой апынулася РП у першай трэці XVII ст., і сцвярджаючы пра адметны статус ВКЛ у складзе федэратыўнай дзяржавы, трэба канстатаваць, што важнае значэнне набывае вывучэнне пазіцыі Княства адносна знешнепалітычнага курсу РП. Неабходнасць гэтага вынікае з патрэбы асэнсавання ўплыву ВКЛ на ход падзей і складванне пэўнай геапалітычнай сістэмы.

У прапанаванай працы даследуюцца месца і роля ВКЛ у сістэме ўзаемаадносін РП з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст. Гэта праблема з'яўляецца надзвычай актуальнай у айчыннай гістарыяграфіі, паколькі згаданае пытанне ў ёй не разглядалася. Абранне ж у якасці прадмета даследавання пазіцыі шляхты ВКЛ адносна найважнейшых праблем дзяржаўнага жыцця – знешняй палітыкі – пашырае веды пра ўнутраны статус ВКЛ у складзе РП. Апошняе з'яўляецца запатрабаваным кірункам як беларускай, так і замежнай гістарыяграфіі, таму што дазваляе глыбей зразумець гістарычны феномен суіснавання ВКЛ і КП у межах адной дзяржавы – Рэчы Паспалітай.

Храналагічныя рамкі дысертацыі акрэсліваюцца першай трэццю XVII ст. Ніжняй мяжой абраны 1600 г., якім пачынаецца новы этап знешняй палітыкі РП як у адносінах да Расійскай дзяржавы – з адпраўлення пасольства Льва Сапегі ў Маскву, так і да Швецыі – пачатак доўгатэрміновага ваеннага канфлікту прадстаўнікоў дынастыі Вазаў за спадчынную карону і панаванне на Балтыцы. За верхнюю храналагічную мяжу даследавання пры разглядзе ўзаемаадносін са

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
Швецыяй прыняты 1629 г. – падпісанне Альтмаркскага перамір'я і завяршэнне з ёй серыі войнаў, а ў дачыненні да адносін РП з Расійскай дзяржавай – 1632 г., якім разам са смерцю Жыгімонта III Вазы і пачаткам Смаленскай вайны завяршыўся асобны этап у гісторыі ўзаемаадносін гэтых дзяржаў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

### Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца часткай навукова-даследчых тэм "Унутры- і міжсаслоўныя адносіны на беларускіх землях у XVI–XVIII стст." (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20113056) і "Рэлігійныя працэсы і іх уплыў на стан беларускага грамадства ў XVI–XVIII стст." (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20113993), якія выконваюцца на кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі", зацверджанай на 2011–2015 гг.

### Мэта і задачы даследавання

*Аб'ектам даследавання* з'ўляюцца ўзаемаадносіны РП з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.

*Прадмет даследавання* – пазіцыя палітычнага народа (шляхты) ВКЛ у сістэме ўзаемаадносін РП з Расіяй і Швецыяй.

*Мэта* дадзенай працы – вызначыць месца і ролю ВКЛ у сістэме ўзаемаадносін РП з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.

Для дасягнення ўказанай мэты былі пастаўлены наступныя *задачы*:

1) ахарактарызаваць уплыў ВКЛ на фарміраванне знешнепалітычнай лініі РП; даць агульную (для ўсёй РП) і асобную (у дачыненні да ВКЛ) ацэнку знешнепалітычнага курсу дзяржавы ў першай трэці XVII ст.;

2) вылучыць у сістэме знешнепалітычных прыярытэтаў РП ролю ўзаемаадносін з Расійскай дзяржавай; даць ім характарыстыку праз прызму інтарэсаў ВКЛ і РП, а таксама фактара Дзмітрыяды; паказаць гістарычную дынаміку ў правядзенні абазначанага кірунку ў жыццё з пункту гледжання ВКЛ;

3) вылучыць у сістэме знешнепалітычных прыярытэтаў РП месца шведскага кірунку і даць яму характарыстыку праз прызму інтарэсаў ВКЛ і РП; паказаць гістарычную дынаміку ў правядзенні абазначанага кірунку ў жыццё з пункту гледжання ВКЛ;

4) высветліць ступень уплыву палітычнага народа на фарміраванне знешнепалітычнай пазіцыі ВКЛ (РП) у сістэме ўзаемадачыненняў "шляхта –

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
магнаты-ураднікі"; вызначыць ролю найбольш уплывовых дзеячаў ВКЛ у знешняй палітыцы РП у першай трэці XVII ст.;

5) выявіць асноўныя матывацыйныя фактары ў фарміраванні знешнепалітычнай пазіцыі шляхты ВКЛ і ахарактарызаваць іх.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Умовамі Люблінскай уніі 1569 г. прадугледжвалася сумесная знешнепалітычная дзейнасць ВКЛ і КП, аднак на практыцы Княства мела ўласнае бачанне спраў міжнароднага характару, што было абумоўлена спецыфікай геапалітычнага становішча і наяўнасцю ўласных інтарэсаў, адрозных ад імкненняў кароннай шляхты і каралеўскай улады. Асобны статус ВКЛ у складзе федэратыўнай дзяржавы прадстаўляў пэўныя магчымасці самастойнасці ў сферы знешнепалітычных адносін і дазваляў улічваць вышэйпералічаныя фактары. Знешнюю палітыку РП трэба прызнаць недастаткова сбалансаванай, што негатыўна ўплывала на становішча ВКЛ.

2. Адносіны РП і Расійскай дзяржавы ў пачатку XVII ст. вызначаліся імкненнем захаваць статус-кво, што было адлюстраваннем знешнепалітычнай лініі ВКЛ. Аднак да дэстабілізацыі стасункаў прывяла авантура Ілжэдзмітрыя I, падтрыманая ўплывовымі магнатамі КП і манархам РП. Шляхта ВКЛ, за некаторым выключэннем, не падтрымала Дзмітрыяду. Удзел у ёй асобных прадстаўнікоў РП быў абумоўлены інтарэсамі меркантыльнага характару. Паглыбленне канфлікту адбылося падчас інтэрвенцыі РП у Расійскую дзяржаву. У кантэксце разладжаных адносін РП і Расіі тэрытарыяльныя набыткі не мелі іншай перспектывы, як ваеннай пагрозы з боку Расійскай дзяржавы. Інтэрвенцыя раскалола палітычную эліту ВКЛ: вылучыліся яе прыхільнікі і праціўнікі. Няўдачы інтэрвенцыі скіравалі погляды палітычнай эліты да падтрымання ранейшага статус-кво. Прыкладам разважнасці ў адносінах да Расіі можна лічыць пазіцыю павятовай шляхты ВКЛ, якая на працягу ўсёй ваеннай кампаніі выступала за падтрыманне мірных адносін з усходнім суседам. Перыяд ад Дэўлінскага пераміра'я да Смаленскай вайны у адносінах РП і Расійскай дзяржавы характарызаваўся напружанасцю, што было абумоўлена шэрагам нявырашаных пытанняў, звязаных з тытулатурай манархаў, памежнымі спрэчкамі. Гэта выклікала асцярогі шляхты ВКЛ адносна ўзнікнення новай вайны паміж РП і Расійскай дзяржавай.

3. Шведскі вектар належаў да ліку бясспрэчных знешнепалітычных прыярытэтаў РП, і ВКЛ было ўцягнута ў вырашэнне балтыйскага пытання. Вызначальнымі ў межах акрэсленага кірунку былі дынастычныя амбіцыі Жыгімонта III Вазы, дзеля чаго ён ахвяраваў дзяржаўнымі інтарэсамі РП і вёў нерацыянальны знешнепалітычны курс. Вайна 1600–1611 гг. успрымалася шляхтай ВКЛ як абарончая і была ёй падтрымана. У далейшым зацяжны

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

характар канфлікту і яго негатыўныя наступствы пабуджалі шляхту ВКЛ патрабаваць ад манарха прымірэння са Швецыяй і адмовы ад дынастычных прэтэнзій. Непадатлівасць караля пры падтрымцы КП, ахвяраванне інтарэсамі Княства вымушалі ВКЛ ісці на сепаратныя пагадненні са Шведскім Каралеўствам.

4. На прыкладзе шэрагу канкрэтных сітуацый даказана, што магнатыўраднікі ВКЛ істотна ўплывалі на знешнюю палітыку РП. Яскравымі прыкладамі з'яўляецца Мітаўскае пагадненне Крыштофа Радзівіла 1622 г. і дзейнасць Льва Сапегі. Пры ўсёй той вазе, якую мела павятовая шляхта ў палітычнай сістэме РП, на практыцы яе роля ў фарміраванні знешнепалітычнага курсу дзяржавы была абмежаванай. Шляхецкае саслоўе з'яўлялася своеасаблівым стрымліваючым фактарам, ад якога патрабавалася санкцыя на ажыццяўленне мерапрыемстваў, звязаных са знешняй палітыкай: зацвярджэнне падаткаў на ваенныя патрэбы, вырашэнне соймам пытанняў вайны і міру, арганізацыя паспалітага рушэння.

5. У фарміраванні знешнепалітычнай пазіцыі шляхты ВКЛ можна вылучыць два асноўныя матывацыйныя фактары – палітычны і эканамічны. Першы выяўляўся ў дзяржаўнай салідарнасці з КП, што прывяло да ўдзелу ВКЛ у войнах з Расіяй і Швецыяй. Але ваенныя страты і пагрозы, а таксама тое, што кароль пачаў вайну без згоды сойма і дзеля ўласнага дынастычнага інтарэсу, вялі да негатыўнага ўспрымання войнаў шляхтай ВКЛ. Эканамічны фактар першапачаткова заключаўся ў зацікаўленасці пэўных магнатаў ВКЛ у атрыманні асабістых выгод (маёнткаў, пасад і інш.). Аднак негатыўныя эканамічныя наступствы вайны вымушалі ВКЛ у цэлым імкнуцца да міру.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дадзеная дысертацыйная праца з'яўляецца самастойным уласным даследаваннем суіскальніка, якое ажыццяўлялася з выкарыстаннем шырокага кола крыніц і літаратуры. Аўтарам быў праведзены пошук і аналіз дакументальнага матэрыялу, асноўная частка якога знаходзіцца ў замежных архівасховішчах і аддзелах рукапісаў бібліятэк, у прыватнасці Рэспублікі Польшча. Акрамя таго, былі задзейнічаны матэрыялы апублікаваных крыніц, а таксама дасягненні айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, а таксама на спецыялізаваных навуковых чытаннях і школах: Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час" (Гродна, 4–5 красавіка 2007 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, прысвечанай

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

90-годдзю Гетманату Паўла Скарападскага "Дні науки історичного факультету-2008" (Кіеў, 23–24 красавіка 2008 г.); "X республиканской научно-методической конференции молодых ученых" (Брэст, 15–16 мая 2008 г.); Пасяджэннях "Летней школы молодых историков Беларуси и России – 2008" (Мінск, 18–23 жніўня 2008 г.); II Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы" (Гомель, 9–10 кастрычніка 2008 г.); Международных научных чтениях, посвященных 130-летию со дня рождения первого ректора БГУ, выдающегося ученого-слависта, академика В.И. Пичеты (Мінск, 28–29 кастрычніка 2008 г.); Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці (да 90-годдзя ўтварэння БССР)" (Мінск, 27 лютага 2009 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю гістарычнага факультэта БДУ "Сучасныя тэндэнцыі развіцця гістарычнай навукі і адукацыі" (Мінск, 25 верасня 2009 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Романовские чтения – VI (к 75-летию исторического факультета УО "МГУ им. А.А. Кулешова")" (Магілёў, 24–25 лістапада 2009 г.); III Міжнароднай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў "Беларусь в современном мире" (Гомель, 20 мая 2010 г.); "Круглым стале", прысвечаным 160-годдзю з дня нараджэння беларускага гісторыка, архівіста, археолага А.П. Сапунова (1851–1924) і 100-годдзю адкрыцця Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута (Мінск, 28 красавіка 2011 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі маладых навукоўцаў, прысвечанай 20-годдзю абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 90-годдзю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта "Актуальныя праблемы айчыннай і сусветнай гісторыі" (Мінск, 27–28 верасня 2011 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Романовские чтения – VIII" (Магілёў, 24 лістапада 2011 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі і матэрыялы дысертацыйнага даследавання прадстаўлены аўтарам у 14 навуковых публікацыях, у тым ліку 4 – у рэцэнзаваных навуковых часопісах і зборніках аб'ёмам 3 аўтарскія аркушы, 8 – у зборніках матэрыялаў і тэзісаў дакладаў навуковых канферэнцый, 2 – у іншых навуковых зборніках. Агульны аб'ём апублікаваных артыкулаў складае 5,5 аўтарскія аркушы.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя ўключае пералік умоўных абазначэнняў, уводзіны, агульную характарыстыку працы, тры главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс. Поўны памер дысертацыі складае 141 старонку (тэкст – 114, бібліяграфія – 27). Бібліяграфічны спіс уключае 361 адзінку , з іх 14 – аўтарскія публікацыі.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

**Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках навуковых прац**


1. Дземідовіч, А.В. Люблінская унія 1569 г. ва ўспрыманні шляхты беларускіх зямель (другая палова XVI – першая трэць XVII стст.) / А.В. Дземідовіч // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С.В. Марозава [і інш.]. – Гродна, 2007. – С. 224–228.

2. Дземідовіч, А.В. Адносіны Вялікага княства Літоўскага са Шведскім каралеўствам у канцы XVI – пачатку XVII ст. у святле рашэнняў Люблінскага сойму 1569 г. / А.В. Дземідовіч // Studia Historica Europae Orientalis : науч. сб. / Респ. ин-т высш. шк. ; отв. ред.: А.В. Мартынюк, Г.Я. Голенченко. – Минск, 2008. – Вып. 1. – С. 132–140.

3. Дземідовіч, А.В. Узаемадачыненні Вялікага княства Літоўскага з Расійскай дзяржавай (першая трэць XVII ст.) / А.В. Дземідовіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Эканоміка. Права. – 2008. – № 3. – С. 3–7.

4. Дземідовіч, А.В. Вялікае княства Літоўскае ў знешнепалітычным курсе Рэчы Паспалітай (першая трэць XVII ст.) / А.В. Дземідовіч // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. : в 2 ч. / Респ. ин-т высш. шк. ; редкол.: М.И. Демчук (пред.) [и др.]. – 2009. – Вып. 8, ч.1. – С. 14–22.

5. Дземідовіч, А.В. Вялікае княства Літоўскае падчас інтэрвенцыі Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву 1609–1618 гг. / А.В. Дземідовіч // Український історичний збірник : наук. пр. асп. та молодих вчених / НАН України, Ін-т історії ; редкол.: Т. Чухліб (голов. ред.) [та ін.]. – Київ, 2010. – Вип. 13, ч. 1. – С. 68–82.

6. Дземідовіч, А.В. Дыпламатычныя стасункі Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай у пачатку XVII ст. / А.В. Дземідовіч // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 5. – С. 47–53.


**Матэрыялы канферэнцый**


7. Демидович, Е. Смоленск во взаимоотношениях Великого княжества Литовского и Московской державы в XVI – первой трети XVII ст. / Е. Демидович // Дні науки історичного факультету : матеріали міжнар. конф. студентів, аспірантів та молодих учених, присвяченої 90-річчю Гетьманату Павла Скоропадського, Київ, 23–24 квіт. 2008 р. : у 2 ч. / Київ. нац. ун-т ; редкол.: В.Ф. Колесник (голова) [та ін.]. – Київ, 2008. – Ч. 2. – С. 128–130.

8. Дземідовіч, А.В. Расійска-вялікакняжацкая мяжа ў першай трэці XVII ст.: канфлікты і пагадненні / А.В. Дземідовіч // Беларусь і суседзі:

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўпывы : матэрыялы II Міжнар. навук. канф., Гомель, 9–10 кастр. 2008 г. / Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Р.Р. Лазько (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2008. – С. 5–9.

9. Дземідовіч, А.В. Стаўленне шляхты Вялікага княства Літоўскага да ўзаемастасункаў дзвюх частак Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. / А.В. Дземідовіч // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці: да 90-годдзя ўтварэння БССР : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 27 лют. 2009 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А.І. Андарала [і інш.]. – Мінск, 2009. – Ч. 1 : Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ад старажытнасці да 1918 г. – С. 53–56.

10. Дземідовіч, А.В. Узаемадачыненні Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй (першая трэць XVII ст.) / А.В. Дземідовіч // III Машеровские чтения : материалы респ. науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 24–25 марта 2009 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А.Л. Гладков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2009. – С. 96–98.

11. Дземідовіч, А.В. Ілжэдзмітрыяда і адносіны да яе шляхты Вялікага княства Літоўскага / А.В. Дземідовіч // Романовские чтения – 6 (к 75-летию исторического факультета УО "МГУ им. А. А. Кулешова") : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 24–25 нояб. 2009 г. / Могилев. гос. ун-т ; редкол.: И.А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Могилев, 2010. – С. 177–178.

12. Дземідовіч, А.В. Адлюстраванне адносін шляхты Вялікага княства Літоўскага да вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй у соймікавых інструкцыях (першая трэць XVII ст.) / А.В. Дземідовіч // Беларусь в современном мире : материалы III Междунар. науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Гомель, 20 мая 2010 г. / Гомел. гос. техн. ун-т ; редкол.: В.В. Кириенко (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2010. – С. 164–166.

13. Дземідовіч, А.В. Узаемаадносіны Вялікага Княства Літоўскага з Расійскай дзяржавай у пачатку XVII ст. Расійская гістарыяграфія пытання / А.В. Дземідовіч // Романовские чтения – 8 : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 24 нояб. 2011 г. / Могилев. гос. ун-т ; редкол.: Я.Г. Риер (пред.) [и др.]. – Могилев, 2012. – С. 87–89.

**Тэзісы дакладаў**

14. Дземідовіч, А.В. Узаемаадносіны Вялікага княства Літоўскага са Швецыяй у першай трэці XVII ст. / А.В. Дземідовіч // X республиканская научно-методическая конференция молодых ученых : сб. тез. докл., Брест, 15–16 мая 2008 г. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. К.К. Красовского. – Брест, 2008. – С. 157.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

# РЭЗЮМЭ


**Дземідовіч Алена Васільеўна**

**Вялікае Княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.**

**Ключавыя словы:** Рэч Паспалітая, Вялікае Княства Літоўскае, Каралеўства Польскае, Расія, Швецыя, знешняя палітыка, вайна, перамір'е, шляхта, манарх, палітычная эліта, сойм, соймік.

**Мэта даследавання** – вызначыць месца і ролю Вялікага Княства Літоўскага ў сістэме ўзаемаадносін Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.

**Метады даследавання.** Дысертацыйнае даследаванне было праведзена з дапамогай агульнанавуковых метадаў: аналізу, сінтэзу; індукцыі, дэдукцыі; аналогіі, параўнання; мадэлявання. З шэрагу спецыяльна-гістарычных метадаў былі выкарыстаны гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнаўчы. Былі задзейнічаны метады герменеўтыкі.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Вызначаны месца і роля Вялікага Княства Літоўскага ў сістэме ўзаемаадносін Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст. Упершыню на аснове шырокага кола крыніц і літаратуры ацэнены пазіцыя і ўплыў Вялікага Княства Літоўскага ў стасунках Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй. Паказана дынаміка стаўлення шляхты да ўвасаблення вышэйзгаданых кірункаў знешняй палітыкі ў жыццё, вызначаны асноўныя матывы, якія фарміравалі пэўную пазіцыю вышэйшага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры стварэнні навуковых прац і дапаможнікаў па знешняй палітыцы Рэчы Паспалітай, па сацыяльна-палітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, а таксама па агульным курсе гісторыі Беларусі. Праца можа выкарыстоўвацца падчас распрацоўкі спецкурсаў па гісторыі міжнародных адносін Паўночнай і Усходняй Еўропы.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

# РЕЗЮМЕ

**Демидович Елена Васильевна**

## Великое Княжество Литовское во внешнеполитических отношениях Речи Посполитой с Россией и Швецией в первой трети XVII ст.

**Ключевые слова:** Речь Посполитая, Великое Княжество Литовское, Королевство Польское, Россия, Швеция, внешняя политика, война, перемирие, шляхта, монарх, политическая элита, сейм, сеймик.

**Цель исследования** – определить место и роль Великого Княжества Литовского в системе взаимоотношений Речи Посполитой с Россией и Швецией в первой трети XVII ст.

**Методы исследования.** Диссертационное исследование было проведено с помощью общенаучных методов: анализа, синтеза; индукции, дедукции; аналогии, сравнения; моделирования. Из ряда специально-исторических методов были использованы историко-генетический, историко-сравнительный. Были задействованы методы герменевтики.

**Полученные результаты и их новизна.** Определены место и роль Великого Княжества Литовского в системе взаимоотношений Речи Посполитой с Россией и Швецией в первой трети XVII ст. Впервые на основе широкого круга источников и литературы оценены позиция и влияние Великого Княжества Литовского в отношениях Речи Посполитой с Россией и Швецией. Показана динамика отношения шляхты к воплощению вышеупомянутых направлений внешней политики в жизнь, выявлены основные мотивы, которые формировали определенную позицию высшего сословия Великого Княжества Литовского.

**Рекомендации по использованию результатов диссертации.** Результаты исследования могут быть использованы при создании научных работ и пособий по внешней политике Речи Посполитой, по социально-политической истории Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой, а также по общему курсу истории Беларуси. Работа может использоваться при разработке спецкурсов по истории международных отношений Северной и Восточной Европы.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## SUMMARY

**Alena V. Dzemidovich**

### The Grand Duchy of Lithuania in foreign affairs of the Polish-Lithuanian Commonwealth with Russia and Sweden in the first third of the XVII century

**Key words:** the Polish-Lithuanian Commonwealth, the Grand Duchy of Lithuania, the Kingdom of Poland, Russia, Sweden, foreign policy, war, truce, gentry, monarch, political elite, Sejm, Sejmik.

**Purpose of the research** – to determine the place and role of the Grand Duchy of Lithuania in the system of relations of the Polish-Lithuanian Commonwealth with Russia and Sweden in the first third of the XVII century.

**Methods of the research.** The dissertation research was conducted with general scientific methods: analysis, synthesis; induction, deduction; analogy, comparison; modelling. Among special historical methods the following were used – historical genetic, historical comparative. Methods of hermeneutics were involved.

**Achieved results and their novelty.** The place and role of the Grand Duchy of Lithuania in the system of relations of the Polish-Lithuanian Commonwealth with Russia and Sweden in the first third of the XVII century were determined. The dissertation reveals on the basis of a great number of sources the position and influence of the Grand Duchy of Lithuania in the relations with Russia and Sweden. The dynamics of the gentry attitudes to implementation of the above mentioned foreign policy was shown. Basic motives which formed definite attitudes of the upper class of the Grand Duchy of Lithuania were determined.

**Recommendations on use of the results of the dissertation.** The results of the dissertation can be used while creating scientific works and textbooks on foreign policy of the Polish-Lithuanian Commonwealth, on social and political history of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish-Lithuanian Commonwealth and also on general course of the history of Belarus. The work can be used while making out special courses in the history of foreign affairs of northern and eastern Europe.

